

У СТУДЭНТЫ — ПАСЛЯ 60

4

ВАНДРОЎКА ЯК КВЭСТ

5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

9 ВЕРАСНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 177 (29799)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алеся АБРАМЕНКА, намеснік міністра эканомікі:**

*«Акцэнт антыманапольнай палітыкі павінен быць зменены з выяўлення парушэнняў, звязаных з прычыненнем шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам канкрэтных юрыдычных ці фізічных асоб, на выпрацоўку падыходаў па ўстараненні ўрону канкурэнцыі па прычыне яе абмежавання. Важна знайсці баланс паміж прымяненнем мер па развіцці прамысловай палітыкі і антыманапольнага рэгулявання, антымізацыі рэгулявання ў сферах натуральных манаполій, кантролю за дзяржудзелам у эканоміцы. Важна павысіць празрыстасць фарміравання тарыфаў і затрат суб'ектаў натуральных манаполій праз укараненне ў практыку органа рэгулявання натуральных манаполій інстытута «публічных слуханняў» і доўгатэрміновага тарыфнага рэгулявання паслуг суб'ектаў натуральных манаполій».*

# МАЛАДОСЦЬ НА ВАРЦЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Другі год пасля заканчэння Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках Крысціна ГОРБАЧ працуе аграномам па насенняводстве ў найлепшым у Пухавіцкім раёне СВК — «Абярэг-Агра». За гэты час дзяўчына добра асвоіла спецыфіку важнага сектара гаспадаркі, без якога немагчыма правесці азімую альбо яравую сяўбу. Пасля паспяховай жніўнай кампаніі, у якой Крысціна таксама была задзейнічана, малады спецыяліст правярае захаванасць збожжавага насення ў засеках, кантралюе выкананне норм і тэхналогіі механізатарамі ў час восеньскай сяўбы, удзельнічае ў калектыўным узгадненні севазвароту. Азімыя зерневыя культуры ў гаспадарцы сёлета сеюцца на плошчы ў 1800 гектараў, і таму Крысціна дзённы час праводзіць на полі.*

Без тэрміну даўнасці

## БЕЛАРУСЬ ПАРТЫЗАНСКАЯ: НАВУКОВАЕ І АСАБІСТАЕ

### 80 гадоў таму быў створаны Беларускі штаб партызанскага руху



Пётр Калінін.

**Рэспубліка-партызанкай наша краіна атрымала права называцца за беспрэцэдэнтны патрыятычны рух у адзін з найбольш складаных перыядаў гісторыі — гады Вялікай Айчыннай вайны. Без загадаў і прымусаў нашы суайчыннікі пакінулі свае ўтульныя хаты (калі ў кагосьці яны яшчэ засталіся) і сталі адзіным фронтам на абароны сваёй зямлі. Пасля вайны на ўдзельнікаў партызанскага руху выліўся шквал крытыкі, але яны годна выстаялі і ў гэтым супрацьстаянні. Дакументы не хлусяць — навукоўцы і архівісты ўжо даўно даказалі, што народныя мсціўцы ўнеслі важкі ўклад у Вялікую Перамогу.**

СТАР. 3

Па палічках

## Арэнда жылля: студэнцкі ажыятаж усё ж прысутнічае

З-за зніжэння цэн на рынку арэнды з інтэрнатаў на здымныя кватэры з'ехалі традыцыйна больш забяспечаныя замежныя студэнты



**«Пандэмія і закрытыя граніцы моцна ўдарылі па рынку арэнднага жылля галоўнага горада краіны. У пікавы момант сталіца пазбавілася 50—60 % кватэранаймальнікаў, рынак арэнды быў запоўнены свабоднымі кватэрамі, і цэны папаўзлі ўніз». — Менавіта так ацэньвалі сітуацыю спецыялісты ў пачатку года. Потым былі падзеі сакавіка і красавіка, калі падскочыў у цане долар і арэнда асела.**

СТАР. 13

## КОРАТКА

- Найлепшыя распрацоўкі «100 ідэй для Беларусі» прэзентуюць на Фестывалі навукі ў Мінску.
- **У Мінску з нагоды Дня горада бясплатна афармляюць карткі Mastercard Gold.**
- Рысь напала на людзей у Магілёўскім раёне. Пацярпелыя — двое магіляўчан. Драпежніка ліквідавалі.

ISSN 1990 — 763X

22177

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «ШТО КАЖА НАРОД?»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай. «Улічваючы, што вы вельмі шмат праводзіце сустрэч з людзьмі (і тэлефонныя прамыя лініі, і сам-насам), што кажа народ? Я таксама шмат сустракаўся апошнім часам з людзьмі. Можа, мне не ўсё скажуць, як вам, таму гэта вельмі важна», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама пацікавіўся, чым зараз займаецца Савет Рэспублікі, і спытаў пра планы на найбліжэйшую перспектыву.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што пры верхняй палаце парламента працуе Экспертны савет. «Што вы бачыце, у якім напрамку тут рухацца, каб нам прымаць больш выверанья і дакладныя законы ў нашай дзяржаве?» — спытаў ён.

Наталля Качанава расказала журналістам, што адной з тэм сустрэчы з Прэзідэнтам стала работа са зваротамі грамадзян. «Галоўнае ў нашай палітыцы — людзі. І тое, чым жывуць яны сёння, хвалюе нас. Людзі звяртаюцца абсалютна з рознымі пытаннямі, але мы бачым зрэз у цэлым. Я хачу сказаць, што людзі вельмі па-добраму ставяцца да сваёй краіны. Гэта праўда. Бачачы тое, што адбываецца ў свеце, мусісь, зараз па-іншаму некалькі ацэньваюць усё тое, што адбываецца ў нас. Тады, калі мы забяспечваем харчовую бяспеку, тады, калі на нашых вуліцах мір і спакой. Вядома, людзі гэта цэняць», — сказала яна.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што частка пытанняў, з якімі грамадзяне звяртаюцца да сенатараў, павінны вырашацца мясцовымі органамі ўлады. І ў Савеце Рэспублікі трымаюць гэта на кантролі. Калі нешта неабходна ўрэгуляваць на заканадаўчым узроўні, парламентарыі бяруць гэта на заметку.

«Для нас зваротная сувязь з людзьмі вельмі важная: мы разумеем, якія пытанні сёння найбольш актуальныя для таго ці іншага рэгіёна. У сваёй рабоце мы гэта вельмі актыўна выкарыстоўваем», — падкрэсліла Наталля Качанава.



Фота БелТА.

# «САМ БОГ ЗАГАДАЎ НАМ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Мурманскай вобласці Андрэем Чыбісам. Візіт дэлегацыі Мурманскай вобласці ў нашу краіну праходзіць з 7 да 11 верасня. Рабочы графік на беларускай зямлі ў мурманчан дастаткова насычаны. Адразу пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі адбыліся перагаворы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. Акрамя таго, дэлегацыя наведала ААТ «МАЗ» і ААТ «Белкамунмаш».**

## «СЁННЯ КАНКУРЭНТАЎ НАМ У РАСІІ ПРАКТЫЧНА НЯМА»

Вітаючы Андрэя Чыбіса, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ён у Мурманскай вобласці бываў часцей, чым губернатар названага рэгіёна ў Беларусі. «Гэта сведчыць аб тым, што мы заўсёды будзем чакаць вас у любым складзе, вашу дэлегацыю і людзей Мурманскай вобласці. Ёсць пра што паразмаўляць і ёсць тыя напрамкі, па якіх мы павінны супрацоўнічаць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заўважыў, што таварабарот паміж Беларуссю і Мурманскай вобласцю — больш за 100 мільёнаў долараў. Ён задаў рытарычнае пытанне: гэта шмат ці гэта мала? «Мусіць, лічба прыгожая, але, відавочна, — не мяжа і не адпавядае тым магчымасцям, якімі мы з вамі валодаем», — падкрэсліў ён.

Беларускі лідар прывёў лічбы. Па выніках першага паўгоддзя 2022 года аб'ём гандлю вырас амаль на 23 працэнты. Але ў першую чаргу за кошт паставак з Мурманскай вобласці (павелічэнне імпарту на 35,1 працэнта пры скарачэнні экспарту з Беларусі на 20,7 працэнта). Ён выказаў думку, што гэты дысбаланс можа быць выраўнены. Галоўнае, што ёсць чым выраўноўваць.

«У цяперашніх умовах для нас стратэгічная тэма — пераарыентацыя часткі беларускіх экспартных грузаў, перш за ўсё калійных угнаенняў, на вашыя парты. Ды і не толькі калійных угнаенняў. Павінен сказаць, што па ўсіх пытаннях мяне інфармавалі, і мы прынялі рашэнне, што будзем супрацоўнічаць у гэтым напрамку з Мурманскай вобласцю, нягледзячы на тое што цяпер мы цесна прывязаны і ўжо працуем з Санкт-Пецярбургам», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што разам з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным азнаёміўся з партовай інфраструктурай Санкт-Пецярбурга. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, ён папярэдзіў Прэзідэнта Расіі аб жаданні супрацоўнічаць і з Мурманскай вобласцю. Адпаведныя дамоўленасці былі прыняты кіраўнікамі абедзвюх краін.

«Ёсць невялікае пытанне, якое датычыцца дастаўкі грузу чыгуначным транспартам. Ведаю, што гэта пытанне федэральнага ўрада. Але калі вы да яго падключыцеся, мы хутчэй вырашым гэтае пытанне. Прынцыповыя рашэнні ў гэтым напрамку прыняты, будзем працаваць. Ведаю, што вы падтрымліваеце такі від супрацоўніцтва», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што паўночны напрамак дапоўніць супрацоўніцтва ў сферы лагістыкі, якое таксама выбудоўваецца з Санкт-Пецярбургам. «Я веру ў тое, што калісьці будзе вельмі бурна развівацца паўночны напрамак: праз Паўночны Ледавіты акіян, пастаўка грузаў у азіяцкую частку нашай планеты. Гэта будзе бомба. Павінен сказаць, што, калі ў нас добра пойдзе супрацоўніцтва, можам сур'ёзна дадаць мільёны тон, каб развіваць гэты напрамак», — падкрэсліў ён.

## «ГАТОВЫ ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО»

Што да іншых напрамкаў супрацоўніцтва, то адным з вядучых Прэзідэнт назваў пастаўку тэхнікі ў Мурманскую вобласць. І перш за ўсё — БелАЗ. «Сёння канкурэнтаў нам у Расіі практычна няма, заходнія кампаніі сышлі. Нават калі і не сышлі, яны нам не канкурэнты па кошце-якасці. І ведаю, што горна-абагачальныя кампаніі ідуць на кантакт, супрацоўнічаюць, купляюць нашу тэхніку», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што да канца года Беларусь паставіць у Мурманскую вобласць больш за 30 адзінак, 15 машын — у 2023 годзе. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта толькі ў першым набліжэнні. Ён упэўнены, што паставак машын будзе больш.

«Нам вядома ваша цікавасць да шахтавай тэхнікі. Можаце быць упэўнены, што мы акажам вам усялякую падтрымку па ўсіх напрамках супрацоўніцтва ў гэтай часткы», — канстатаваў Прэзідэнт. Ён выказаў спадзяванні на працяг супрацоўніцтва па вытворчасці электратранспарту. Перш за ўсё — прадукцыі «Белкамунмаша». Кіраўнік дзяржавы назваў гэта перспектыўным, важнай і для Мурманска. «Зрабілі аўтобус у паўночнай камплектацыі. Сёння значная частка парка сталіцы Рускай Поўначы — аўтобусы Мінскага аўтамабільнага завода. У гэтым напрамку Бог загадаў нам супрацоўнічаць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Важны напрамак работы — пастаўка камунальных, дарожных і спецыяльных машын. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі выраблiяецца нямала такой тэхнікі. І ў сённяшніх умовах яна можа быць важнай для Мурманскай вобласці і як прадукт імпартазамяшчэння», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт назваў важным напрамкам супрацоўніцтва і харчовую бяспеку. «У вас там не ўсё расце, можа, і не трэба — у вас ёсць іншыя кірунк і развіцця. Яшчэ з савецкіх часоў жыхары Мурманскай вобласці з задавальненнем куплялі нашы прадукты харчавання, у тым ліку і з палёў, бульбу і іншае. Можам прадоўжыць, калі вас гэта задавальняе», — заўважыў ён.

Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Мурманскай вобласцю развіваецца і ў іншых сферах — у прамысловым будаўніцтве, пастаўках будаўнічых матэрыялаў, ліфтавага абсталявання. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Мурманск — хоць і далёка, але бліжэй, чым Сахалін, з якім у нашай краіны наладжана шчыльнае супрацоўніцтва.

«Ведаю, што вы нядаўна прыводзілі сур'ёзную нараду ў вобласці наконт забеспячэння насельніцтва ўсім неабходным. Мы навучыліся рабіць станцыі водаачысткі і іншыя мерапрыемствы, звязаныя з чыстай вадой. Праграма «Чыстая вада» і ў нас рэалізоўваецца. Таму з вялікім задавальненнем гатовы тут падставіць сваё плячо», — прапанаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка назваў візіт Андрэя Чыбіса ў Беларусь адкрыццём новага этапу супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Мурманскай вобласцю. «Усё, аб чым мы дамовімся, а мы можам дамовіцца па шматлікіх пытаннях (нашы магчымасці вы ведаеце), я запэўніваю вас, нягледзячы на ўсялякія санкцыі і іншае, мы выканаем. Яшчэ раз дзякую вам за тое, што вы знайшлі час і прыехалі ў сваю Беларусь, да суседзяў», — сказаў Прэзідэнт.

## НОВЫ ВЕКТАР УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

У сваю чаргу, губернатар Мурманскай вобласці Андрэй Чыбіс падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за цёплы прыём і максімальную паглыбленасць ва ўсе аспекты двухбаковага супрацоўніцтва. Андрэй Чыбіс нагадаў, што Мурманская вобласць была адным з першых рэгіёнаў ужо сучаснай Расіі, якая заключыла пагадненне з Беларуссю. Застаўся ў памяці мурманчан і візіт Аляксандра Лукашэнкі да іх у рэгіён.

«Сёння мы фактычна адкрываем новую гісторыю ўзаемадзеяння, — падкрэсліў губернатар. — Камунікацыя паміж Мінскам і Мурманскам захавалася. Сёння ў нас ёсць усе магчымасці перазагрузіць, прычым узаемавыгадна, нашы адносіны». У прыватнасці, губернатар Мурманскай вобласці падзякаваў беларускаму лідару за рашэнне, якое Аляксандр Лукашэнка агучыў па лагістыцы. «Я памятаю вашу ініцыятыву прыкладна год таму, калі пачаліся пытанні па лагістыцы ў Прыбалтыцы, — удакладніў Андрэй Чыбіс. — Вы тады сказалі, што будзем праз Мурманск гэтым займацца. І сапраўды, вашы калегі разам з маімі калегамі дэталёва прапрацавалі канкрэтны варыянт. Я ўпэўнены, што ўсе эканамічныя пытанні, нават з пункту гледжання кошту дастаўкі грузаў, вырашальныя».

Аб узмацненні двухбаковага партнёрства сведчыць і той факт, што ў Мурманскай вобласці дадаткова будуць закупляць «БелАЗы», шахтавую тэхніку, аўтобусы і тралейбусы. І гэта нягледзячы на тое, што многія еўрапейцы, якія яшчэ нядаўна сышлі з расійскага рынку, ужо заявілі аб сваёй гатоўнасці вярнуцца. У гэтым кантэксце пазіцыя мурманчан адназначная — арыентавацца на беларускіх партнёраў, сяброў і калег. І гэта не пустыя словы. У Мурманскай вобласці запусцілі вялікую праграму па абнаўленні транспарту — «Транспарт Поўначы», у якой значную частку складае тэхніка беларускай вытворчасці.

«Прынцыповае рашэнне карыстацца тэхнікай менавіта беларускай вытворчасці ёсць, — адзначыў губернатар Мурманскай вобласці. — Яно прынята кампаніямі, і гэта таксама вялікі ўзровень супрацоўніцтва. Вакол гэтага ўзнікае гісторыя з сэрвісным цэнтрам, адукацыяй, павелічэннем колькасці маладых хлопцаў, якія будуць гэтай тэхнікай карыстацца і ёй кіраваць».

Аднак і з гэтым праблем не будзе. Прэзідэнт Беларусі агучвае канкрэтнае рашэнне: наш бок гатовы падрыхтаваць столькі, колькі патрэбна, спецыялістаў для працы на «БелАЗах» і іншай тэхніцы. Больш за тое, работа ў гэтым ключы ўжо пачалася. Як паведаміў Андрэй Чыбіс, у Мурманску сумесна з «БелАЗам» адкрываюцца спецыяльныя класы (пачынаючы са школы, заканчваючы каледжамі), каб рыхтаваць юнакоў пад гэтую тэхніку. «Цяпер гэта канкурэнтаздольная, патрэбная тэхніка для нашай прамысловасці», — рэзюмаваў ён.

Падчас візіту ў Беларусь губернатар Мурманскай вобласці возьме ўдзел у адкрыцці Міжнароднага форуму эканамічнага супрацоўніцтва, наведае ААТ «БелАЗ» і ААТ «Амкадор».

Што датычыцца турыстычнага кірунку двухбаковага ўзаемадзеяння, то будзе абмеркавана пытанне аб адкрыцці авіязносін паміж Мінскам і Мурманскам. Беларусь зацікаўлена ў прыцягненні турыстаў з расійскага рэгіёна, улічваючы попыт на паездкі ў айчынныя санаторыі, якія даўно карыстаюцца высокай рэпутацыяй у замежных гасцей. Са снежня 2021 года Беларуская чыгунка сумесна з ААТ «Расійскія чыгункі» аднавілі зносіны па маршруце Мінск — Мурманск — Мінск. Аднак, несумненна, цягнік, які курсіруе па маршруце толькі раз на тыдзень, у поўнай меры не можа задаволіць патрэбы пасажыраў абедзвюх краін. На думку спецыялістаў, авіярэйс паміж Мінскам і Мурманскам будзе карыстацца папулярнасцю ў насельніцтва дзвюх краін. Дэпартамент па авіяцыі «Мінсктранса» і кампанія «Белавія» мяркуюць, што на бягучы момант вырашэнне пытання магчыма сіламі расійскіх авіякампаній.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У ТЭМУ

Падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з губернатарам Мурманскай вобласці былі абмеркаваны і два новыя кірункі супрацоўніцтва. «Гэта супрацоўніцтва ў галіне жывёлагадоўлі, у тым ліку мадэрнізацыя нашых магутнасцяў па поўначы, і ўзаемныя магчымасці ў будаўніцтве, — паведаміў журналістам **губернатар Мурманскай вобласці Андрэй ЧЫБІС**. — Беларускія падрадчыкі ўжо заключаюць партнёрскія дагаворы па будаўніцтве новага металургічнага завода ў Мурманскай вобласці. Мы таксама абмеркавалі магчымасць удзелу беларускіх кампаній у жыллёвым будаўніцтве. Гэтая тэма сёння актуальная для Мурманскай вобласці». Таксама кіраўнік расійскага рэгіёна лічыць важным выкарыстоўваць увесь спектр дадатковых магчымасцяў, якія могуць паўплываць на плённае двухбаковае супрацоўніцтва. Гэта і гуманітарны абмен, і ўзаемадзеянне маладзёжных арганізацый, і абмен студэнтамі.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб уплыве санкцый на нашы эканомікі, губернатар падкрэсліў, што санкцыі — гэта заўсёды непрыемна, але з пункту гледжання Мурманскай вобласці гэта абмежаванні, якія былі ўведзены заходнімі краінамі, даюць нам новыя магчымасці. «Калі мы кажам аб лагістыцы, Мурманск, як лагістычны цэнтр, сёння вельмі актыўна развіваецца, у тым ліку з-за тых абмежаванняў, якія ўводзяць заходнія краіны, — заўважыў Андрэй Чыбіс. — Па-другое, Мурманская вобласць — скарбніца карысных выкапняў. Напрыклад, расійскі літый раней быў незапатрабаваны, а сёння мы актыўна працуем над тым, каб літый здабываўся і перапрацоўваўся на тэрыторыі Мурманскай вобласці. Санкцыі далі новыя магчымасці для нашага супрацоўніцтва — вельмі выгаднага і для нашых кампаній, і людзей, і вытворцаў».

Блізкая ўлада

# АД ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ ДА ЗЯМЕЛЬНЫХ СПРЭЧАК



**Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, наведаў Клецкі раён. Тут ён правёў прыём грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама наведаў некаторыя арганізацыі і прадпрыемствы.**

На прыём грамадзян звярнуліся жыхары Мар'інай Горкі, Валожына, Слуцка, Баранавіч, Клецкага раёна. Спектр пытанняў, з якімі грамадзяне прыйшлі да Максіма Рыжанкова, быў шырокі: ад працаўладкавання да зямельных спрэчак. Праблемы заяўнікаў, як было адзначана на сустрэчы, дасканала вывучаць і прапрацуюць.

Наведванне першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта рэгіёна пачалося з гімназіі Клецка і першай гарадской школы. Максім Рыжанкоў цікавіўся ў тым ліку матэрыяльна-тэхнічнай базай, харчаваннем школьнікаў, кадравай палітыкай, у прыватнасці, замацоўваннем маладых спецыялістаў. Таксама была ўзнята тэма цэнтралізаванага экзамену, які аб'ядноўвае выпускны з сярэдняй школы і ўступны ва ўніверсітэт. Меркаванне па гэты конт выказалі педагогі і навучэнцы.

З работай мясцовых прадпрыемстваў ва ўмовах санкцый Максім Рыжанкоў азнаёміўся на прыкладзе ААТ «Гама смаку». Першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта азнаёмілі з вытворчасцю, прадэманстравалі лабараторыю, расказаўшы аб тым, адкуль паступае сыравіна і чаму знізіліся аб'ёмы закупак ад насельніцтва. Закранулі пытанні лагістыкі і экспарту, расказалі пра тое, што разбілі ўласны сад.

Як адзначыла дырэктар прадпрыемства Надзея Пальчынская, санкцыі фактычна не паўплывалі на вытворчы працэс. Хоць і стала менш яркай упакоўка тэтра-пак, у якую расфасоўваюць сокавую прадукцыю, якасць засталася ранейшай: у вытворчасці выкарыстоўваецца выключна натуральная сыравіна без генна-мадыфікаваных дабавак.

У ДЛГУ «Клецкі лясгас» гаварылі аб эфектыўнасці работы створаных новых вытворчых участкаў, інавацыйных прадуктах і планах па лесааднаўленні. На прадпрыемстве, у прыватнасці, асвоілі новую тэхналогію па выпуску тэрмадошкі. Мадэрнізацыя дазваляе нарасціць аб'ёмы вытворчасці, пашырыць рынкі збыту і атрымаць добры эканамічны эфект.

Асобным пунктам стала наведванне ААТ «Грыцэвічы». Гэтае сельгаспрадпрыемства знаходзіцца пад асабістай апекай старшыні райвыканкама Анатоля Ладыгі. Цяпер перад гаспадаркай стаіць мноства задач, у тым ліку па вытворчасці прадукцыі ў жывёлагадоўчым цэху, па раслінаводстве, абнаўленні машынна-трактарнага парка.

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 10 верасня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

— старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА. Тэл. 8 016 226 99 26;

— намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Віктаравіч ДУРНОЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

— старшыня Гомельскага Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЯНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

— старшыня Гродзенскага Савета дэпутатаў Алена Васільеўна ПАСЮТА. Тэл. 8 015 273 56 44;

— кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Таццяна Мікалаеўна ШАЎЦОВА. Тэл. 8 017 500 41 60;

— намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

— кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Супрацоўніцтва

## МАШТАБНАЯ ВЫСТАВА БЕЛАРУСКІХ ТАВАРАЎ ПРОЙДЗЕ Ў ТАДЖЫКІСТАНЕ

**У Душанбэ 11—12 кастрычніка адбудуцца знакавыя дзелавыя падзеі з удзелам бізнесу Беларусі — экспазіцыя Made in Belarus, а таксама Таджыкска-Беларускі бізнес-форум. Мерапрыемствы пройдуць на тэрыторыі гатэля Hyatt Regency Dushanbe. У Таджыкістан прыбудзе беларуская дэлегацыя: прадстаўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, кіраўнікі кампаній, профільныя эксперты.**

На выставе будуць прадстаўлены такія галіны, як харчовая прамысловасць, сельская гаспадарка, машынабудаванне, будаўніцтва, дрэваапрацоўка, ахова здароўя, фармацэўтыка, нафтахімія, навука і адукацыя. Агульная плошча складзе больш за дзвесце квадратных метраў. Удзел у экспазіцыі Made in Belarus на гэты момант пацвердзілі «Белкамунмаш», «Белшына», Беларускі металургічны завод, «Гомсельмаш», Гродзенскі мясакамбінат, Мінскі маторны завод, Мінскі трактарны завод і іншыя прадпрыемствы.

У праграме бізнес-форуму — шэраг дзелавых мерапрыемстваў: прэзентацыі эканамічнага патэнцыялу і прадпрыемстваў, цырымонія падпісання дакументаў, двухбаковыя перагаворы. Акрамя таго, беларуская дэлегацыя наведае шэраг буйных кампаній Таджыкістана.

Арганізатарам бізнес-форуму ад Беларусі выступае Беларуская гандлёва-прамысловая палата. Выстава і форум праводзяцца пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Таджыкістан.

Вольга Шпілеўская:

# «Наша сіла — у адзінстве і любові да краіны»

## БСЖ да Дня народнага адзінства ладзіць шмат цікавых акцый і праектаў


Фота БелТА.

**Учора ў Нацыянальнай бібліятэцы адбыўся арганізаваны Беларускім саюзам жанчын круглы стол «Сіла дзяржавы — у адзінстве народа!» Круглы стол прымеркаваны да Дня народнага адзінства і накіраваны на захаванне гістарычнай памяці і кансалідацыю грамадства для вырашэння агульнанацыянальных задач.**

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», дырэктар Беларускага нацыянальнага прадстаўніцтва МТРК «Мір» Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** падчас круглага стала, звяртаючыся да актывістак БСЖ, падкрэсліла: «Наша сіла — у адзінстве і любові да краіны, у якой мы жывём».

Старшыня Беларускага саюза жанчын пераканана: любая добрая справа і нават мір пачынаюцца з жанчын. «Менавіта таму адзінства жанчын — тое, што здольна не проста зрабіць свет лепшым, а накіраваць яго на стварэнне, згуртаваць вакол навакольных», — упэўнена Вольга Шпілеўская.

Беларускі саюз жанчын паважліва ставіцца да Дня народнага адзінства. Рэгулярныя мерапрыемствы з гэтай нагоды праводзіліся яшчэ з мінулага 17 верасня. Жанчыны не проста цікавяцца, але і вельмі сур'ёзна ўдзельнічаюць у фарміраванні таго грамадства, у якім жывуць.

Накіраванасць свята для аб'яднання па большай частцы сямейная — будуць праводзіцца тэматычныя спартыўныя мерапрыемствы і акцыі для ўсёй сям'і. Доўгатэрміновы праект — «Марафон добрых спраў». 17 верасня будзе днём добрых спраў: пасадка алей, сустрэчы з ветэранамі арганізацыі, сумесна з БРСМ рэалізуюцца інтэрнэт-праекты, чэленджы, фотавыставы і гэтак далей. Словам, усе актыўнасці БСЖ скіраваны на тое, каб паказаць яркі і прыгожы твар беларускай жанчыны, якая ўдзельнічае ва ўсіх сферах дзейнасці дзяржавы. Таксама 17 верасня актывісткі саюза павіншуюць мам дзяцей, якія нарадзіліся ў гэты дзень. 16 верасня стартуе творчы праект на пляцоўцы ў ГЦ «Сталіца». Мяркуецца, што гэта будзе выстава творчых работ жанчын з кожнага рэгіёна Беларусі. Гэтым праектам прадугледжваецца даць старт поўнамаштабнай выставе рукатворных вырабаў жанчын з розных куткоў краіны, каб паказаць іх творчую рэалізацыю ва ўсіх сферах. Таксама 13 верасня ў Віцебску і 16 верасня ў Слуцку будуць праводзіцца ўжо традыцыйныя жаночыя форумы.

**Ксенія ДАБРАБЫТ.**

# БЕЛАРУСЬ ПАРТЫЗАНСКАЯ: НАВУКОВАЕ І АСАБІСТАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Чарговай нагодай пагаварыць аб ролі партызан у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала 80-годдзе стварэння Беларускага штаба партызанскага руху. Падчас міжнароднага круглага стала «У мэтах узмацнення сувязі і кіраўніцтва партызанскімі атрадамі Беларусі...», які адбыўся ў Нацыянальным архіве, вядучыя спецыялісты па ваеннай гісторыі расказалі аб малавядомых фактах партызанскага руху, падзяліліся сваімі поглядамі на недакладную інтэрпрэтацыю гістарычных фактаў.

— Існуе меркаванне, што за столькі гадоў пасля вайны мы вывучылі партызанскі рух, — заўважыў **загадчык аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Беларусі Святаслаў КУЛІНОК**. — Гэта не так. Існуе шэраг аспектаў па тэме партызанскага руху, якія яшчэ патрабуюць навуковага асэнсавання. У прыватнасці, да гэтага часу няма ні адной навуковай дысертацыі, сур'ёзнай манаграфіі, прысвечанай рабоце Беларускага штаба партызанскага руху. Я ўжо не кажу пра асобныя кірункі: разведвальны, дыверсійны, забеспячэнне і інш. Яшчэ нямала пытанняў, дакументы па якіх патрэбна ўводзіць у навуковы абарот. Толькі ўнікальны фонд Беларускага штаба партызанскага руху, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве, уключае звыш 11 тысяч адзінак захоўвання.

Аб рабоце, якая вядзецца па папулярызацыі і публікацыі дакументаў па гісторыі партызанскага руху, расказаў **дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Андрэй ДЗЕМЯНЮК**. «Значную ўвагу мы ўдзяляем увядзенню ў навуковы абарот новых дакументальных крыніц па гісторыі партызанскага руху, — адзначыў ён. — Гэта выклікана дзвюма важнымі абставінамі. Па-першае, складам дакументаў, якія захоўваюцца: менавіта ў Нацыянальным архіве знаходзіцца найбуйнейшы ва ўсходняй Еўропе комплекс дакументаў па гісторыі партызанскай барацьбы. Па-другое, архіў чула рэагуе на запыты навуковай супольнасці і грамадскасці. Тэматыка выданняў, якія публікуюцца, разнастайная. Аднак тэма партызанскай барацьбы і партызанскага руху была і застаецца важнай у публікацыйнай рабоце архіва».

Пры гэтым, як аднагалосна сцвярджаюць спецыялісты, сістэмна і глыбока дзейнасць Беларускага штаба партызанскага руху не вывучана. У той жа час заходняя гістарыяграфія, па словах **загадчыка Цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксея ЛІТВІНА**, вельмі дасканала аналізавала вопыт нашага партызанскага руху. «1942 год быў знамянальны год для нашай гісторыі, у прыватнасці для развіцця партызанскага руху, — перакананы доктар гістарычных навук. — Менавіта тады былі створаны і апрабаваны найбольш дзейсныя формы апаратыўнага кіраўніцтва партызанскай структурай. Самым галоўным ва ўсім гэтым было стварэнне да канца 1942 года стройнай сістэмы рэспубліканскіх і абласных штабоў партызанскага руху».

Гучаў падчас круглага стала і не зусім навуковы пункт гледжання на мінулыя падзеі. Унук начальніка Беларускага штаба партызанскага руху, цёзка свайго легендарнага дзеда, Пётр Калінін расказаў, што памятае многіх партызанскіх камандзіраў. «Пасля вайны яны часта сустракаліся, пілі гарбату і гутарылі на розныя тэмы (у многіх з іх нават удалося пасядзець на каленях), — успамінае ўнук Пятра Калініна. — Дзед для мяне быў аўтарытэтам. Многія гады я спрабую будаваць сваё жыццё па яго прыкладзе. Для мяне вялікі гонар насіць імя свайго дзеда, а таму я ніколі не магу сабе дазволіць зрабіць няправільны крок».

Унучка кіраўніка БШПР Наталля Шэлег кажа, што ёй вельмі пашанцавала ў жыцці, бо разам з бабуляй і дзядулем яна жыла з сямімесячнага ўзросту і знаходзілася з імі да апошняга іх уздыху. «Пётр Калінін з'яўляўся ўзорам таго, якім трэба быць чалавекам, сем'янінам, — падзялілася яна. — Я, у сваю чаргу, бачыўшы, як будуецца сямейны ўклад Пятра Захаравіча і нашай бабулі, ладзіла так і сваё жыццё. Аднак, нягледзячы на ўсю занятасць дзеда, яго адказныя пасады, ён заўсёды ўдзяляў нам шмат увагі».

Нашчадкі Пятра Калініна пішуць кнігу пра свайго знакамітага продка, у якой хочуць паказаць яго не столькі як партызанскага камандзіра, а як звычайнага чалавека, грамадзяніна сваёй краіны, бацьку, дзядулю. Застаецца чакаць з'яўлення кніжнай навінкі.

**Вераніка КАНЮТА.**

Прыемная навіна

# У Любані заззяла «Вясёлка»

**Доўгачаканая і радасная падзея адбылася ў горадзе Любані, што на Міншчыне. Тут расчыніў дзверы новы дзіцячы садок № 1 «Вясёлка». У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця дашкольнай установы прынялі ўдзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА і старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

— Практычна за год пабудавана новая дашкольная ўстанова. Дзіцячы садок — гэта здарова, таму што развіваецца новы мікраераён, нараджаюцца дзеці. Гэта сведчыць пра тое, што ў горада ёсць будучыня, — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Менавіта з дзіцячага садка пачынаецца фарміраванне асобы выхаванцаў як грамадзян, патрыётаў. Першыя навыкі, веды, уменні яны атрымліваюць тут.

Вядома, на свята прыняту прыязджаць з падарункамі. Ігар Сергеенка ўручыў загадчыцы дзіцячага сада Тамары Верамейчык сертыфікат на 10 тысяч рублёў ад Адміністрацыі Прэзідэнта для набыцця гульнявога абсталявання.

Тамара Верамейчык правяла экскурсію па дзіцячым садку для шаноўных гасцей. А паказаць сапраўды было што. У садку створана тэрыторыя сумеснай творчасці для бацькоў і дзяцей. Абсталяваны цэнтр бяспекі, дзе малыя будуць знаёміцца з асновамі бяспекі жыццядзейнасці ў розных сітуацыях. Таксама ўладкаваны цэнтр STEM, у якім дзеці атрымаюць веды па камп'ютарнай тэхніцы, мегаканструяванні. У спецыяльнай студыі выхаванцы будуць ствараць мультыплікацыйныя фільмы. Да паслуг юных грамадзян і сэнсарны пакой, які раздзелены на функцыянальныя зоны — актыўную і рэлаксацыі. Тут кожнае дзіця зможа займацца з навучальнымі, развіццёвымі дапаможнікамі, зняць эмацыянальнае напружанне, расслабіцца.





— Наогул, у рабоце дзіцячага садка прадугледжана мноства напрамкаў работы. Нездарма мы яго назвалі «Вясёлка», — адзначыла Тамара Верамейчык. — Напрыклад, у холе другога паверха арганізаваны цэнтр, дзе выхаванцы далучацца да культурных каштоўнасцяў і традыцый беларускага народа, азнаёмяцца з родным горадам, краінай. Гэта дапаможа закласці ў іх асновы грамадзянскасці і патрыятызму.

— У гэтым маладым мікраёне, які будуецца, пашыраецца, вельмі запатрабаваны дзіцячы садок. Для бацькоў важная крокавая даступнасць, якой яны аддаюць перавагу пры выбары дашкольнай установы. Дзіцячы садок разлічаны на 150 месцаў, — дадала загадчыца.

Ганаровае права перарэзаць сімвалічную стужку аддалі шматдзетнай сям'і Каратчэняў. Дзмітрый і Ірына гадуюць шасцярых дзяцей. Старэйшыя Ангеліна і Даніл вучацца ў гімназіі, Ягор, Мацвей і Цімафей — школьнікі. А самы малодшы чатырохгадовы Паўлік пойдзе ў новы дзіцячы садок.

Задаволена, што будзе працаваць у такім прыгожым будынку, аснашчаным па апошнім слове, і выхавальніца Валерыя Каліценя. «Аб'ект пераўзышоў усе мае чаканні», — падкрэсліла яна. Валерыя закончыла Салігорскі дзяржаўны каледж у мінулым годзе. Размеркавалі ў дзіцячы садок у Смалявічах. Вырашыла пераехаць на сваю малую радзіму, бліжэй да бацькоў, якія жывуць у Любані. Валерыя па спецыяльнасці дэфектолаг, будзе весці групу дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

Адкрыццё новых садкоў і школ сведчыць, што Мінская вобласць дынамічна развіваецца. 1 верасня ў Смалявічах уведзена ў дзеянне новая школа, днямі адкрыецца новы дзіцячы садок у Фаніпалі, у перспектыве тут таксама — будаўніцтва школы. Прапрацоўваецца пытанне ўзвядзення вялікай школы ў Салігорску.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота БелТА.**

Надвор'е

# Замаразкі адмяняюцца, на іх месца прыйдуць дажджы

### А бабінага лета пакуль няма

**Апошні месяц лета быў сапраўды гарачы, але гэта мы зразумелі толькі ў верасні, калі стала не халаднавата, а проста холадна. Бо сярэдняя тэмпература паветра першага тыдня каляндарнай восені аказалася на 1—6 градусаў ніжэй за кліматычную норму. На працягу найбліжэйшага тыдня ў Беларусі паніжаны тэмпературны рэжым захаваецца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Паводле слоў сіноптыкаў, чакаецца, што ў пятніцу на паўднёва-заходнія рэгіёны Беларусі, а ў найбліжэйшыя выхадныя ў большасць раёнаў краіны франтальныя раздзелы прынясуць доўгачаканыя дажджы. У асобных абласцях яны павінны палепшыць складаную пажаранебяспечную абстаноўку. Дарэчы, менавіта па паўднёвым захадзе краіны, днём месцамі пройдуць дажджы дастаткова моцныя. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будзе слабы туман. Вецер усходні, паўднёва-ўсходні 4—9 м/с, парывы да 14 м/с. Днём паветра прагрэецца да 12—18 градусаў, месцамі — да 20 цяпла.

У суботу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 2 да плюс 9 градусаў, а на паўднёвым захадзе ад плюс 10 да плюс 12 градусаў. Днём слупок тэрмометра падымецца да адзнакі плюс 10—17 градусаў, а месцамі — да плюс 19 градусаў.

Дажджлівае надвор'е працягнецца і ў нядзелю. Такім чынам, 11 верасня на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя, магчымыя навальніцы. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 4—11 градусаў, а ўдзень ад плюс 8 да 14 градусаў цяпла.

У панядзелак ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі Беларусі, а днём пераважна па яе паўднёва-ўсходняй палове прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 4—10 градусаў, удзень плюс 9—16 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, надвор'е пачне злёгку мяняцца ўжо ў аўторак. У гэты дзень чакаецца пераважна без ападкаў. Толькі ноччу месцамі па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 3 да плюс 10 градусаў, а ўдзень — ад плюс 13 да плюс 20 градусаў. Чакаем бабінага лета.

**Сяргей КУРКАЧ.**

А вы чулі?

# ВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

**Аляксандр Кульчыцкі-Габіч у гэтым годзе стаў самым відным першакурснікам Беларусі. Свой студэнцкі білет Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта мужчына атрымаў у 61 год.**

Але трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса ў яго ўжо не атрымаецца — гэты статус яшчэ ў 2006 годзе атрымаў Алан Сцюарт, калі ў 97 гадоў абараніў чацвёрты дыплом па спецыяльнасці «Стаматолаг-хірург» і стаў магістрам па медыцыне.

Штогод ВНУ Беларусі прымаюць у студэнцкія сем'і тысячы ўчарашніх выпускнікоў. Хтосьці ідзе па вышэйшую адукацыю, каб стаць высокакваліфікаваным спецыялістам, хтосьці — таму, што «так трэба». Але рэзананснымі з'яўляюцца выпадкі, калі студэнтамі становяцца людзі сталага ўзросту, маючы не адну адукацыю і багаты працоўны вопыт. Што кіруе імі, хто па жаданні душы праз дзесяцігоддзі зноў садзіцца за студэнцкую парту?

«Вучэнне — свет, а невучэнне — цемра», — вядомая ўсім народная мудрасць, якой прытрымліваецца і Аляксандр Кульчыцкі-Габіч. Маючы за плячыма вышэйшую тэхнічную адукацыю, ён у 60 гадоў вырашыў крута павярнуць свой лёс і атрымаць другі — медыцынскі — дыплом у ВДМУ.



Фота sb.by

На пытанне, што прывяло яго зноў да лекцый і семінараў, адказвае, што асабісты арганізм. Мужчына-інжынер шмат гадоў жыў у Расіі, на прадпрыемстве кіраваў аддзелам па аўтаматызаваных сістэмах упраўлення, адказваў за тэхналагічную бяспеку. І зразумеў, што па-майстэрску разбіраецца ў машынах, а на асабісты механізм — сваё цела — не хапае часу. Гледзячы на гэтага не па гадах жыццярадаснага і бадзёрага чалавека, адразу ўзнікае думка, што сакрэт вечнай маладосці Аляксандр Багданавіч усё ж такі знайшоў.

Аказалася, што пасля 30 гадоў ён пачаў цікавіцца ўсходняй літаратурай і стаў займацца ёгай, на працягу дзесяці гадоў практыкаваў вегетарыянства. Зараз рацыён крыху пашыраны, але, як і раней, у ім архі, кашы, зялёны чай — ніякага фастфуду і цяжкіх для пераварвання прадуктаў. Яшчэ юнаком займаўся спортам — цяжкай атлетыкай і дзесяцібор'ем, але зразумеў, што арганізм не жалезны — сёння актыўна займаецца хадзьбой: на дамашнім трэнажоры або па дарозе ва ўніверсітэт.

Калі Аляксандр Багданавіч вырашыў паступіць другі раз у жыцці, запісаўся на факультэт давузаўскай падрыхтоўкі і пачаў узмоцнена рыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання. Расказвае, што цяжэй за ўсё давалася біялогія — навука, якая адкрывае перад чалавекам самыя дзіўныя факты пра арганізм. Напрыклад, аказваецца, што з-за рэгенерацыі клетак печань юнака і ўжо пажылога чалавека прыблізна аднолькавая — яе «ўзрост» у сярэднім складае менш чым тры гады.

Па выніках ЦТ мужчына набраў 215 балаў і ішоў да сваёй мэты па-за конкурсам, але ўпэўнена. Плануе выправіцца на практыку пасля трэцяга курса і ўжо задумваецца аб аспірантуры. Гэты рэдкі выпадак, напэўна, сёлета здзівіў кожнага, але на рэакцыю грамадства Кульчыцкі-Габіч не звяртае ўвагі. Галоўнае, што яго цікавіць, — ранняе выяўленне, лячэнне і прафілактыка аўтаімунных захворванняў. Напрамак медыцыны не з лёгкіх, але, сцвярджае мужчына, ён прывык ставіць перад сабой высокую планку.

«Наш знакаміты студэнт — чалавек з багатым жыццёвым вопытам і якаснай інжынернай адукацыяй. У нашай краіне няма дыскрымінацыі па ўзросце для паступлення на дзённыя аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў. Абмежаванні, у большасці сваёй медыцынскія, могуць быць звязаны толькі з асаблівасцямі прафесіі. У дзяржаўныя ВНУ вядзецца прыём усіх ахвотных, галоўнае — вытрымаць уступныя экзамены. Таму Аляксандра Багданавіча мы з радасцю прынялі ў наша медыцынскае студэнцкае брацтва», — пракаментаваў **рэктар ВДМУ Анатоль ШЧАСНЫ.**

Разам з 700 першакурснікамі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр Кульчыцкі-Габіч у верасні атрымаў запаветны студэнцкі білет і зараз з натхненнем і старанасцю наведвае лекцыі. А ўсім, хто дагэтуль не вырашаецца споўніць сваю мару і ліха павярнуць лёс незалежна ад узросту, дае параду: «Дзейнічайце, бо жыццё вельмі кароткае, каб адкладваць яго на заўтра».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Сядзі і глядзі

# ЖЫЦЦЁ АБАЯЛЬНЫХ ЛЮДЗЕЙ

**У гэтыя выхадныя ёсць прычына згадаць сцэнарыста, паэта, рэжысёра Генадзя Шпалікава з нагоды яго 85-годдзя. А ў эфіры тэлеканалаў «Культура» і АНТ можна будзе ўбачыць яго фільм «Доўгае шчаслівае жыццё» і дакументальнае кіно пра самога майстра.**



Мастацкая кінастужка рэжысёра выйшла на «Ленфільме» ў 1966 годзе і расказвае гісторыю маладых людзей Алены і Віктара, якім здаецца, што выпадак звёў іх для доўгага і шчаслівага жыцця. Аднак раніцай і следу не застаецца ад усіх слоў, што сказалі адно аднаму ўвечары, бо раптам пры новай сустрэчы ўсё набывае зусім нечаканыя адценні... Не прапусціце паказы фільма «Доўгае шчаслівае жыццё» ў суботу 10 верасня і ў нядзелю 11-га ў паўторы вечарам на канале «Культура».

А вось на АНТ у суботу можна паглядзець дакументальны фільм Алесі Фокінай «Жыццё абаяльнага чалавека», які распавядае пра рэжысёра Шпалікава, які марыў быць ваенным, але знайшоў сваё прызначэнне ў кінамастацтве. Яго сцэнарыямі поўніліся кінастудыі краіны, аднак трыумф Генадзь Шпалікаў зведаў пасля фільма «Я крочу па Маскве», бо стала зразумела, што героі мяняюцца ў адпаведнасці з часам. Стужка «Доўгае і шчаслівае жыццё» стала яго адзінай рэжысёрскай работай, а фільм «Ты і я» (пастаўлены па яго сцэнарыі) прагрымеў на Венецыянскім кінафестывалі. Аднак, ці рабіла яго ўсё гэта шчаслівым? Даведаемся ў дзённым эфіры 10 верасня.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 154

Пайшоў з жыцця беларускі шахматны кампазітар Дзмітрый Вітальевіч Жылко. Ён нарадзіўся ў 1975 годзе ў Лунінцы Брэсцкай вобласці. У школьныя і студэнцкія гады быў прызёрам абласных маладзёжных спаборніцтваў, чэмпіёнам Лунінецкага раёна сярод дарослых па практычнай гульні, пераможцам конкурсаў рашэння шахматных задач Беларускага тэлебачання для маладых шахматыстаў. Пазней жыў у Мінску, працаваў у IT-сферы. Склаў 120 задач, з якіх кожная трэцяя была адзначана ў конкурсах, а 4 задачы трапілі ў «Альбом ФІДЭ 2010—2012» — сусветную анталогію найлепшых кампазіцый. У складзе зборнай Беларусі ў 2013 годзе падзяліў 5-6 месцы на камандным чэмпіянаце свету па кампазіцыі. Паспяхова выступаў у першынствах Беларусі і міжнародных кубках «Альбіна» па рашэнні задач, быў бронзавым прызёрам аднаго з такіх кубкаў. Пэўны час складаў і шашачныя кампазіцыі.

Прапануем адну з яго задач, якая перамагла ў тэматычным конкурсе нашай газеты 30 гадоў таму (*гл. дыяграму*).

**Белыя:** Крb6, Фd7, Лf6, Кd6, Кd8, пп. b3, e3, f7 (8).

**Чорныя:** Крd5, Фg4, Сa6, Кb4, Кg7, пп. c5, e5 (7).

**Мат за 2 хады.**

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru



* * *

У Маскве прайшоў традыцыйны камандны Кубак Міхаіла Бацвінніка сярод дзіцячых зборных краін СНД. У кожным матчы дарослы капітан каманды (грасмайстар або майстар) даваў сапернікам сеанс аднačасовай гульні на чатырох дошках, а дзеці, яго таварышы па камандзе, адпаведна змагаліся ў сеансе з капітанам сапернікаў. Агульны вынік паядынку вызначаўся па суме набраных ачкоў. Капітанам беларускай каманды быў малады грасмайстар Міхаіл Нікіценка, у склад зборнай уваходзілі Дзяніс Бруцкі, Арцём Бляўскі, Сяргей Барышчык і Юлія Лявонава. Наша каманда саступіла Расіі з лікам 3:5, згуляла ўнічыю (4:4) з Азербайджанам і Казахстанам, а астатнія зборныя перамагла (Арменію, Узбекістан і Таджыкістан — з лікам 5:3, Кыргызстан і Туркменістан — 5,5:2,5). У выніку Беларусь заняла трэцяе месца з дзевяці (1-е — Расія, 2-е — Азербайджан). М. Нікіценка набраў 29 ачкоў з 32 магчымых.

* * *

У Гродне прайшоў традыцыйны шахматны фестываль з шэрагам дзіцячых турніраў у праграме. У «дарослым» турніры (68 удзельнікаў) прызавую тройку склалі Міхей Навуменка, Аляксей Грыгаровіч і Яраслаў Наўмовіч, на чацвёртым месцы фінішаваў адзіны грасмайстар Віталь Цецераў. У хуткіх шахматах (107 гульцоў) перамагла Аляксандра Тарасенка, другое і трэцяе месцы адпаведна ў Арцёма Бяляўскага і Уладзіслава Каташука. У бліцы (117 удзельнікаў) прызёрамі сталі Арцём Бяляўскі, Варвара Палякова і Уладзіслаў Мухін.

* * *

Мемарыял С. Казака ў Магілёве сабраў 44 удзельнікі. Прызавую тройку склалі Аляксандр Нікіцін, Уладзімір Голубеў і Цімур Гвоздзеў.

* * *

Аляксей Аляксандраў на турніры ў Санкт-Пецярбургу ў хуткіх шахматах заняў 32-е месца са 150, а ў «шахматах Фішара» (са зменěнай першапачатковай расстаноўкай фігур) быў трэці з 58 гульцоў.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Сg5! Не вядзе да мэты 1. Кf7+? Крf4!; 1. Фe2? d4/de!; 1. Фe3? d4!; 1. Сb1? Крf4! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Сяргей Дарошчанка, Віктар Жук, Уладзімір Ізотаў, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



За кадрам

# КВЭСТ-ПАДАРОЖЖЫ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**У суботу, 10 верасня, праект «Камень, нажніцы, папера» адзначыць свой пяты дзень нараджэння з моманту з'яўлення ў эфіры. За плячыма — вандроўкі па 113 гарадах і 370 вёсках Беларусі, 11 500 гадзін здымак і безліч адкрыццяў і здарэнняў «за кадрам», якія назаўсёды засталіся ў памяці іх удзельнікаў, і 240 сустрэч на экране з аўдыторыяй. Напярэдадні святочнай даты мы распыталі шэф-рэдактара і вядучую трэвэл-шоу Вікторыю КАСЯНЮК пра тое, з чаго ўсё пачыналася, што чакае нас у новым сезоне, а таксама як варта вандраваць, каб былі карысць і задавальненне.**



— Пачыналі мы з чэленджу. Дзе чаго толькі не рабілі нашы аўтары: і курыць кідалі навыперадкі, і спрабавалі маладзець, у нас нават у праграме была сапраўдная пластычная аперацыя, на якую згадзілася ўдзельніца. Зараз ужо ў шостым сезоне мы робім перазагрузку, і цяпер наш праект будзе называцца «Камень, нажніцы, папера. Квэст», — распавядае мая суразмоўніца. — Вандроўкі, да фармату якіх мы прыйшлі ў другім сезоне, будуць працягвацца, але ўжо ў новай форме. Цяпер аўтарам праграмы патрэбна будзе пацвярджаць альбо разбураць гістарычныя легенды. Так, пачнём з выпуску пра скарб Напалеона. Быў ён альбо гэта толькі прыгожая легенда? На што арыентавацца тым, хто ўсё ж хоча знайсці яго? І ці сапраўды скарб ляжыць на дне Бярэзіны? На такія вось пытанні будзем шукаць адказы. Паспрабуем даведацца, ці існуе паміж імі таемны ход, ці сябруюць прывіды двух вядомых будынкаў і многае іншае. І кожны раз «падаваць» свае прыгоды будзем у форме квэстаў. А традыцыйны прыём з «каменем, нажніцамі і паперай» дазволіць вызначыць, якую колькасць падказак будзе мець кожны ўдзельнік, каб справіцца з заданнямі квэсту.

— Увогуле, і трэвэл-шоу, і шоу талентаў чымсьці падобныя паміж сабой, і гэта цалкам нармальная з'ява. І калі нас пераўноўваюць, то гэта дае стымул рабіць яшчэ лепш, — разважае Вікторыя. — Мы вядзём акаўнты ў Instagram і на YouTube, дзе адсочваем зваротную сувязь і назіраем, як вандроўкі па Беларусі сталі трэндавай з'явай, асабліва што датычыцца цікавасці да нераспіяраных лакацый. Я і сама люблю больш месцы, дзе няма натоўпу турыстаў, гідаў, кавярань, бо тады атрымліваеш зусім іншыя ўражанні і наогул нібы трапляеш у іншае часавае вымярэнне.

Можна здзейсніць вандроўку ў мінулае, таксама скарыстаўшыся парадамі маёй суразмоўцы. У спіс топ-5 трапілі сядзіба Асмалоўскіх у Блоні, у Снове — сядзіба Рдултоўскіх. Яшчэ можна наведацца ў сядзібу Катлубаеў у Ястрэмбелі ці ў Першамайску не прамінуць сядзібу Завішаў, а таксама з'ездзіць у Раванічы ў сядзібу Слатвінскіх. Вядома, у кожнага ёсць і свой спіс любімых месцаў, таму сёння і настолькі папулярныя разнастайныя праграмы, блогі пра вандроўкі. І ўсе мы шукаем нешта сваё, калі адпраўляемся ў падарожжа «ўжывую» альбо не выходзячы з дому.

— Людзям заўсёды падабалася вандраваць, і гэта тое, што дае нам магчымасць абнуляцца, абнаўляцца, знаходзіць новыя погляды на існуючыя праблемы, развівацца ў новых кірунках, — тлумачыць Вікторыя Касянюк. — Калі падарожнічаеце па Беларусі, перш за ўсё трэба вызначыцца, які адпачынак вам блізкі: з камфортам альбо, умоўна, з экстрымам. Але ў любым выпадку вас чакаюць адкрыцці, прыгоды і сустрэчы з апантанымі сваёй справай людзьмі.

А калі пакуль не гатовыя пракладаць маршрут і купляць квіток да месца прызначэння, тады глядзіце па суботах праграму «Камень, нажніцы, папера» на «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва Вікторыі КАСЯНЮК.**


## «Цёплая восень са «Звяздой»





Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 21 кастрычніка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 27 кастрычніка 2022 года будуць разыграны 7 кропельных кававарак Holt HT-CM-005 і суперпрыз — маслены радыятар Timberg TOR 21 1507BC. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 2 лістапада 2022 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2022 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2022 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Цёплая восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 164 газеты «Звязда» ад 23.08.2022 года.

**Тэлефон для даведак (017) 271 81 53.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.2022 да 31.12.2022.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4223 ад 17.08.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або на II паўгоддзе 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

____ на IV квартал або на II паўгоддзе 2022 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 18.15, 23.50** Зона Х (16+).
**8.05** Зразумелая палітыка.
**9.10, 22.00 Серыял «След» (16+).**
**10.45, 0.25** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.15, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «За крок ад раю» (16+).**
**14.00** «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.50, 15.25 Драма «Кругаварот» (12+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час (прамы эфір).
**21.00** Панарама.
**21.45** Гэта іншае.
**23.30** Сфера інтарэсаў.
**0.10** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.25** Тэлебарометр.
**9.05** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.00, 17.25 Драма «20 хвілін» (16+).**
**10.55, 18.30 Серыял «Акваторыя» (16+).**
**12.25** «Тры першыя спатканні» (16+).
**13.10, 21.15 Серыял «Практыка» (12+).**
**14.05** «На тыдзень» (16+).
**14.50, 0.10** «Да спаткання» (16+).
**15.35** Анімацыйны серыял «Казачныя гісторыі» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**16.55** «Вось такія людзі» (12+).
**20.10 Серыял «Слуга» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.15** «Веру не веру» (16+).
**23.10 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.15, 15.50, 20.30, 23.50** Навіны культуры.
**8.15, 18.10 «Эти глаза напротив». Серыял (16+) [СЦ].**
**10.05, 17.35** «Акцёрскія драмы. Хто сыграе ліхадзея?» Дак. фільм (12+) [СЦ].
**10.45, 16.00 «Начное здарэнне». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.55** «Сваімі словамі».
**13.35** «Арт-гісторыі» [СЦ].
**13.55, 21.05** «Знішчальнікі. Апошні бой» (12+) [СЦ].
**20.00** «Жывая спадчына».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Кадры жыцця».

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Альмерыя» — «Асасуна».
**8.35** На мяжы фолу. Футбольны агляд.
**10.00** Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Дынама-Мінск».
**11.45** Футбол. Чэмпіянат Італіі. «Эмполі» — «Рома».
**13.35** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ЦСКА (Масква) — ФК «Краснадар».
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. Агляд.
**16.20** Хакей. КХЛ. «Барыс» (Нур-Султан) — «Трактар» — (Чалябінск).
**18.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Лакаматыў» (Орша) — «Хімік» (Наваполацк).
**21.10** Матч-пойнт.
**21.40** Спорт-кадр.
**22.15** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. Агляд.
**23.10** Дзюдо. Чэмпіянат Беларусі.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
